Упраўленне па адукацыі Салігорскага раённага
выканаўчага камітэта

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа
Салігорскага раёна”

# Метадычныя матэрыялы па правядзенні шостага школьнага дня

## САЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ
## “Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба “Мая сям’я”



Аўтар: Даліда Людміла
Міхайлаўна,
намеснік дырэктара
па выхаваўчай рабоце
дзяржаўнай установы
адукацыі
“Гоцкі вучэбна-
педагагічны комплекс
дзіцячы сад-сярэдняя школа
Салігорскага раёна”
223735, Мінская вобласць,
Салігорскі раён,
аг.Гоцк, вул.Каржа, 68 А
тэлефон (80174) 2-77-1-95

Гоцк, 2020

**Інфармацыйны ліст**

| | |
|---|---|
| *Тэма метадычнага матэрыялу* | Сацыяльны праект “Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба “Мая сям’я” |
| *Прозвішча, імя, імя па бацьку аўтара, пасада* | Даліда Людміла Міхайлаўна, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце |
| *Год нараджэння, адукацыя, кваліфікацыйная катэгорыя* | 1964, вышэйшая адукацыя, першая кваліфікацыйная катэгорыя (1989 г.) |
| *Накірункі дзейнасці* | Арганізацыя занятасці ў шосты школьны дзень: выхаванне культуры адпачынку, сямейнае выхаванне, выхаванне гендэрнай і прававой культуры |
| *Мэтавая група* | Вучні 1-11 класаў, законныя прадстаўнікі вучняў |
| *Поўная назва ўстановы адукацыі* | Дзяржаўная ўстанова адукацыі<br>“Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа Салігорскага раёна” |
| *Адрас установы адукацыі* | 223735<br>Мінская вобласць,<br>Салігорскі раён,<br>аг.Гоцк, вул.Каржа, 68А |
| *Тэлефоны* | 8-0174-2-77-1-95, МТС 802917657544 |
| *E-mail* | gock.school2012@yandex.by |

# Рэцэнзія

Рэкамендавана метадычным саветам
дзяржаўнай установы адукацыі
"Гоцкі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа
Салігорскага раёна"
пратакол № 3 ад 15.02.2020

Сацыяльны праект "Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба "Мая сям'я" прадстаўляе сістэмны падыход да арганізацыі работы з сям'ёй у шосты школьны дзень **(дадатак 2).** Работа ў межах праекта стварае ўмовы для арганізацыі змястоўнага напаўнення вольнага часу сям'і, развіццю творчага патэнцыяла членаў сям'і, умацаванню дзіцяча-бацькоўскіх узаемаадносін, інфармавання сям'і па найбольш важных пытаннях, звязаных з сямейным жыццём, зносінамі паміж бацькамі і дзецьмі, а таксама па фарміраванню прававой культуры.

Праект скіраваны на прапаганду сямейных каштоўнасцей, умацаванне прэстыжу сям'і і бацькоўства, сацыялізацыю дзіцяці ў грамадстве, так як пытанне наладжвання супрацоўніцтва з сям'ёй запатрабавана ў грамадстве.

Мерапрыемствы праекта ў межах шостага школьнага дня прыцягваюць законных прадстаўнікоў вучняў да актыўнага ўдзелу ў выхаваўчым працэсе, робяць бацькоўскую грамадскасць партнёрамі ўстановы адукацыі па вырашэнню агульных задач. Дзейнасць па рэалізацыі праекта дапамагае сродкамі сумесных спраў згуртаваць дзяцей і бацькоў, выпрацаваць сямейныя традыцыі, аказаць сацыяльна-педагагічную і псіхолага-педагагічную падтрымку сям'і.

Метадычныя рэкамендацыі да рэалізацыі практыка-арыентаванага праекта прапаноўваюць шэраг крокаў па яго адаптацыі ў розных установах адукацыі, праз сямейныя клубы, цэнтры, сацыяльныя службы, што зможа ўнесці значны ўклад у пытанне па ахове правоў і інтарэсаў дзяцей, а таксама педагагічнай асвеце сям'і.

Рэалізацыі праекта з яго сістэмным падыход адпавядае сучасным метадычным патрабаванням, мае матэрыяльнае і кадравае забеспячэнне.

Этапы рэалізацыі праекта змястоўныя, напоўненыя канкрэтнымі справамі і скіраваны на дасягненне пастаўленых мэт і задач.

Рэкамендавана для выкарыстання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

Дырэктар установы адукацыі В.В.Ермаковіч

## Анатацыя

Сацыяльны праект “Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба “Мая сям’я” прадстаўляе сістэму і змест работы педагагічнага калектыва з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі ў межах шостага школьнага па ўмацаванню сямейных зносін, павышэнню прававой і педагагічнай культуры, адраджэнню ў сучасных умовах традыцыйнага ладу жыцця сям’і праз арганізацыю актыўнай занятасці членаў сям’і ў мерапрыемствах установы адукацыі.

Частка праекта скіравана на фарміраванне сямейных традыцый з мэтай умацавання бацькоўска-дзіцячых зносін.

Праект зацікавіць адміністрацыю ўстаноў адукацыі, кіраўнікоў бацькоўскіх клубаў (цэнтраў), выхавальнікаў дашкольных устаноў, педагогаў-арганізатараў і асоб, зацікаўленых вырашэннем праблемы аднаўлення ў грамадскім усведамленні традыцыйных каштоўнасцей шлюбу, сям’і, прэстыжу мацярынства і бацькоўства праз стварэнне сямейных клубаў і цэнтраў.

**Змест**

Характарыстыка праекта……………………………………………….6
Актуальнасць праекта……………………………………………………..7
Прынцыпы, формы і метады рэалізацыі праекта………………………..8
Прагназуемыя вынікі…………………………………………………...11
Магчымасці ўстановы адукацыі і рэсурсы па рэалізацыі праекта…….11
Асноўныя накірункі дзейнасці клуба "Мая сям'я"……………………12
Этапы рэаліацыі праекта………………………………………………13
Вывады…………………………………………………………………21
Выкарыстаная літаратура……………………………………………….. 22
Дадатак………………………………………………………………… 23

## Характарыстыка праекта

| Крытэрыі | Характарыстыка |
|---|---|
| Від праекта: | практыка-арыентаваны |
| Падыход да ажыццяўлення: | творчы |
| Творчая ідэя праекта: | прыцягнуць, “запаліць” працай як мага больш аднадумцаў |
| Галоўны прынцып рэалізацыі праекта: | “Школа аграгарадка – важны сацыяльны партнёр сям’і ў выхаванні падрастаючага пакалення” |
| База ажыццяўлення праекта: | дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гоцкі ВПК ДССШ Салігорскага раёна” |
| Тэрмін рэалізацыі праекта: | доўгатэрміновы – 2 навучальныя гады |
| Удзельнікі праекта (мэтавыя групы): | законныя прадстаўнікі вучняў,<br>вучні 1-11класаў, педагогі |
| Супрацоўнікі: | грамадскасць, зацікаўленыя асобы, службы і арганізацыі. |
| Фінансавае забеспячэнне | за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў |
| Метадычныя рэкамендацыі | Праект можа быць адапціраваны ў любым тыпе ўстаноў адукацыі (дзіцячы садок, гімназія, ліцэй). У праекце прапанавана даволі значная колькасць мерапрыемстваў па рабоце з сям’ёй у комплексным падыходзе да справы. У залежнасці ад кадравага патэнцыялу, мэты, запатрабаванняў, узроставых катэгорый мэтавых груп, зацікаўленыя асобы (клубы, цэнтры, службы, установы адукацыі) маюць права змяніць працягласць тэрміну рэалізацыі праекта, абраць для сябе пэўную колькасць спраў, якія іх зацікавяць і якія па сілах ажыццявіць у межах |

| | |
|---|---|
| | выхаваўчага працэсу. Пытанні інфармацыйна-асветніцкай і прафілактычнай дзейнасці з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі таксама можна вызначыць на свой погляд, змяніць альбо дабавіць адпаведна запытаў ўдзельнікаў праекта і актуальных праблем установ адукацыі ў плане супрацоўніцтва з сям'ёй. Формы работы і мерапрыемствы праекта могуць быць выкарыстаны асобна ў межах плана ідэалагічнай і выхаваўчай работы ўстаноў адукацыі па наступных накірунках: сямейнае і гендэрнае выхаванне, прававая культура, здаровы лад жыцця, арганізацыя вольнага часу, культура побыту. |

**Актуальнасць праекта:**

- сям'я – асноўны сацыяльны інстытут грамадства, які прыдае яму стабільнасць, развіццё і прагрэс;
- стварэнне благанадзейнай сямейнай атмасферы садзейнічае паніжэнню негатыўных з'яў у грамадстве, так як асобасныя якасці чалавека фарміруюцца ў сям'і;
- у маладых людзей назіраюцца цяжкасці ў стварэнні і захаванні сям'і;
- назіраецца нізкі культурны ўзровень часткі членаў сямей;
- грубасць, нецярплівасць, п'янства аднаго з бацькоў вядзе да разбурэння сям'і;
- паніжэнне каштоўнасці маладой сям'і і сямейнага ладу жыцця;
- са зменай пакаленняў губляюцца духоўныя і культурныя каштоўнасці сям'і;
- разбурэнне традыцыйнага ладу сям'і – адна з прычын крызісу духоўна-маральнай і сацыякультурнай сферы сучаснага грамадства;
- губляецца традыцыйнае ўспрыманне бацькоўства і дзяцінства;
- культ жыццёвага поспеху, матэрыяльнага дабрабыту, прафесійнага і грамадскага росту прывёў да падзення прэстыжу мацярынства і бацькоўства;
- павелічэнне колькасці сацыяльных сірот;

- эгаізм, уседазволенасць, самасцвярджэнне любым коштам падрываюць сямейныя ўстоі.

**Мэта праекту:** стварыць умовы для павышэння сацыяльнай значнасці сям'і, гарманічных сямейных зносін у выхаванні падрастаючага пакалення, умацаванне яе прэстыжу і бацькоўства сродкамі педагагічна-прававой асветы, арганізацыі вольнага часу і прапаганды сямейных каштоўнасцей.

**Задачы:**

- стварыць умовы для актывізацыі выхаваўчай функцыі сям'і на аснове прапаганды асобаснага прыкладу і аўтарытэту бацькоў, гарманічных унутрысямейных адносін ( традыцый, ладу жыцця);
- прыцягнуць бацькоў і дзяцей для актыўнага ўдзелу ў вырашэнні агульных задач;
- паглыбіць уяўленне моладзі пра сацыяльныя ролі мужа і жонкі;
- прыцягнуць бацькоў да працэсу актыўнага супрацоўніцтва з дзіцем;
- выхоўваць маральныя якасці (шчасце, справядлівасць, міласэрнасць, павагу да старэйшых);
- згуртаваць сем'і і ўнесці пазітыўныя ноткі ва ўзаемаадносіны паміж дзецьмі і бацькамі;
- сфарміраваць гендэрную культуру падлеткаў;
- паказаць важнасць раўнапраўных адносін да другога полу;
- стварыць умовы для самасцвярджэння асобы і творчай рэалізацыі членаў сямей;
- падрыхтаваць моладзь да сямейнага жыцця;
- выхаваць  сур'ёзныя адносіны да шлюбу;
- умацаваць каштоўнасці сям'і ў свядомасці моладзі;
- выхаваць партнёрскія ўзаемаадносіны, узаемапавагу і ўзаемаадказнасць усіх членаў сям'і;
- палепшыць маральна-псіхалагічны клімат сям'і;
- выхоўваць грамадзянска-патрыятычныя маральна-этычныя якасці якасці моладзі; працавітасць;
- умацаваць свет сямей добрымі думкамі і справамі.

## Прынцыпы, формы і метады ажыццяўлення праекта

Законныя прадстаўнікі вучняў (бацькі) усё радзей зацікаўлены выхаваннем дзяцей, якія губляюцца ў камп'ютарнай павуціне і "хаваюцца ў навушнікі". Яны мала часу праводзяць з дзецьмі ў сілу

розных абставін: занятасць на працы, асабістае жыццё, безадказнасць за выхаванне дзяцей. А пра сумесныя справы дарослых і дзяцей амаль няма чаго і казаць. Многія бацькі пасіўныя, таму і дзеці растуць пасіўнымі спажыўцамі. А ім так неабходны станоўчы прыклад дарослых. Вельмі важна, каб бацька не толькі клапаціўся пра матэрыяльны дастатак сям'і, а і сам часцей быў з сынам. Яшчэ важней, каб матуля думала не толькі пра "хлеб надзённы", а і стварала маральны мікраклімат, творчую атмасферу вольнага часу сродкамі сумесных спраў, традыцый у сямейным выхаванні.

Мерапрыемствы па рэалізацыі праекта скіраваны на сумесную дзейнасць дарослых і дзяцей праз святы, конкурсы, спаборніцтвы, выставы, КТС, гульні, прэзентацыі, стварэнне калажаў, інфармацыйна-асветніцкую і валанцёрскую дзейнасць у межах клуба "Мая сям'я". Калі гэтыя формы работы выкарыстоўваюцца ў асноўным педагогам-арганізатарам і класнымі кіраўнікамі, то спецыялісты СППС выкарыстоўваюць для прафілактыкі супрацьпраўных паводзін і фарміравання прававой культуры кіналекторыі, практыкумы, круглыя сталы, трэнінгі, кансультацыі, прагляд і абмеркаванне тэматычных ролікаў і прэзентацый.

Роля бацькоўскай грамадскасці ў дадзеным праекце значная. Члены сямей – актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў праекта. Сумесна з педагогамі рыхтуюць сцэнарыі, праяўляюць ініцыятыву, ажыццяўляюць выкананне даручаных спраў, праводзяць рэпетыцыі. Яны – творцы. Ды і сам праект – творчы саюз дзяцей, бацькоў, педагогаў. Ён сучасны па сваіх формах і метадах, запатрабаваны ў грамадстве і стварае ўмовы для сацыялізацыі дзіцяці.

Дзейнасць клуба "Мая сям'я" ставіць кожнага члена сям'і ў пазіцыю актыўнага ўдзельніка, дае магчымасць рэалізаваць творчыя задумкі, фарміруе інфармацыйны інструментарый. Гэта вядзе да адзінства сям'і, развівае камунікатыўныя навыкі і дарослых, і дзяцей. Ствараецца сітуацыя агульнай зацікаўленасці і творчасці. Кожны член сям'і прыўносіць пасільны ўклад у агульную справу, выступае адначасова і арганізатарам, і выканаўцам, і экспертам дзейнасці. А гэта значыць, што бярэ адказнасць за даручаную справу і свае дзеянні. Педагогі сродкамі клуба "Мая сям'я" дапамагаюць стварыць такую прастору, у якой кожны член сям'і змог бы знайсці аднадумцаў, дапамогу і падтрымку.

Такім чынам, ствараецца душэўны кантакт паміж бацькамі і дзецьмі. Тут мае месца станоўчы прыклад старэйшых, фарміруецца здаровы псіхалагічны клімат у сям'і, назіраецца агульнае захапленне карыснымі справамі.

Для ажыццяўлення ідэі праекта створана творчая група, размеркаваны абавязкі, абраны кіраўнік (куратар) праекта. Па меры неабходнасці да праекта далучаюцца зацікаўленыя педагогі калектыва ўстановы адукацыі, вучні, праводзіцца праца над павелічэннем колькасці сямей – удзельнікаў праекта. Творчая група займаецца напісаннем сцэнарыяў, арганізацыяй рэпетыцый ключавых творчых спраў і правядзеннем мерапрыемстваў. Сістэматычна размяшчаецца інфармацыя аб мерапрыемствах на сайце ўстановы адукацыі.

На падрыхтоўчым этапе з дапамогай бібліятэкара праводзіцца работа па забеспячэнню праекта метадычнай і навукова-папулярнай літаратурай па сямейнаму выхаванню. Увесь змест дзейнасці праекта рэалізуецца праз бацькоўскі клуб “Мая сям’я”, у структуру якога ўваходзіць валанцёрскі атрад “Аднадумцы” пад кіраўніцтвам педагога-арганізатара і члены другога клуба – “Прыёмная сям’я”– актыўныя, творчыя выхавальнікі замяшчальных сямей, якія раздзяляюць ідэю праекта.

На практычным этапе рэалізацыі праекта ў раздзеле “Сямейныя традыцыі і правілы” вырашаецца задача па ўзнаўленню, развіццю і ўкараненню пэўных сямейных традыцый праз правядзенне аднайменнага круглага стала. Сем’і атрымліваюць інфармацыйныя буклеты, у якіх прапануюцца разнастайныя сямейныя традыцыі, правілы сямейнай культуры па ўмацаванню ўнутрысямейных зносін. У канчатковым выніку бацькі павінны будуць трымаць прэзентацыю-справаздачу аб сямейных традыцыях і правілах, што прыжыліся і маюць месца быць у сям’і.

Самым значным, практыка-арыентаваным этапам праекта з’яўляецца “Арганізацыя вольнага часу бацькоў і дзяцей”. Ён забяспечвае ўключэнне іх у разнастайную сумесную дзейнасць: творчую і інтэлектуальна-пазнавальную, працоўную і спартыўную. Работа клуба спланавана на кожны месяц, дзе спалучаюцца прафілактычныя, творчыя і інфармацыйна-асветніцкія справы. Пры неабходнасці праводзіцца карэкціроўка.

Рэалізацыя праекта ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з СППС установы адукацыі. Спецыялісты СППС вывучаюць сем’і, дапамагаюць вырашаць сямейныя праблемы і накіроўваць намаганні на стварэнне станоўчага мікраклімату ў сям’і, даюць парады па сямейнаму і гендэрнаму выхаванню.

У Канвенцыі аб правах дзіцяці гаворыцца, што кожнае дзіця павінна жыць у сям’і. Сям’я – школа культуры. Тут дзіця знаходзіцца ў акружэнні блізкіх людзей, пра яго клапоцяцца, аберагаюць, выхоўваюць, развіваюць. Без цесных зносін з бацькамі, бабулямі,

дзядулямі, брацікамі і сястрычкамі, без увагі і разумення цяжка выхаваць сапраўднага сем'яніна-грамадзяніна.

Праект прадстаўляе сістэмны падыход да арганізацыі сямейнага адпачынку, сумеснай творчасці, інфармавання па найбольш важных пытаннях, звязаных з сямейным жыццём, зносінамі паміж членамі сям'і **(дадатак 2).**

Работа ў дадзеным накірунку ўносіць значны ўклад у пытанне па ахове правоў дзяцей, абароне іх інтарэсаў, дапамозе сям'і з мэтай прафілактыкі сямейнай неблаганадзейнасці.

## Прагназуемыя вынікі

- рост бацькоўскага аўтарытэту;
- павышэнне адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей;
- павышэнне культуры шлюбна-сямейных адносін;
- умацаванне маральных асноў сям'і і сямейных традыцый;
- павышэнне ацэнкі ролі сваёй сям'і і разуменне яе асаблівай важнасці;
- разуменне каштоўнаснай значымасці асоб бліжэйшага акружэння, кожнага члена сям'і і факта значымасці сям'і сярод жыццёвых установак сучаснай моладзі;
- павышэнне ўзроўню выхаванасці дзяцей, творчай ініцыятывы і цікавасці да гісторыі сваёй сям'і;
- паважлівыя адносіны да старэйшых і беражлівыя адносіны да малодшых членаў сям'і;
- умацаванне партнёрскіх узаемаадносін паміж прадстаўнікамі розных узроставых катэгорый у працэсе сумеснай дзейнасці;
- стабілізацыя партнёрскіх узаемаадносін паміж школай і сям'ёй.

Супрацоўніцтва ўдзельнікаў праекта, творчы падыход да папулярызацыі сямейных каштоўнасцей, прэстыжу сям'і будзе садзейнічаць самавыхаванню і самаразвіццю асобы сапраўднага беларуса-сем'яніна, патрыёта, які будзе

- адчуваць сябе годным і шчаслівым,
- мець жаданне быць адукаваным,
- клапаціцца пра бліжняга,
- імкнуцца да высокай маральнасці і выхаванасці.

## Магчымасці ўстановы адукацыі і метадычныя рэсурсы па рэалізацыі праекта

<u>Нарматыўна-прававое забесяпячэнне:</u>

- Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

- Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2016-2020 гады;
- Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Асаблівасці арганізацыі выхаваўчай, ідэалагічнай і сацыяльнай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2019/2020 навучальным годзе”;
- метадычныя аспекты ўдасканалення выхаваўчай работы ў шосты школьны дзень;
- метадычныя рэкамендацыі Міністэрства адукацыі Рэспублiцы Беларусь “Арганізацыя эфектыўнага ўзаемадзеяння ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі з сям’ёй”

| **Кадравае забеспячэнне праекта** | **Матэрыяльныя рэсурсы** |
|---|---|
| кіраўнік клуба “Мая сям’я” | памяшканне для клубнай дзейнасці |
| педагогі дадатковай адукацыі, | актавая зала |
| педагог сацыяльны, | спартыўная зала, стадыён |
| педагог-псіхолаг, | мультымедыйны праектар, экран |
| педагог-арганізатар | камп’ютар |
| творчая група па рэалізацыі праекта | музычная і гукавая апаратура |
| бацькоўскі камітэт | дабравольная матэрыяльна-тэхнічная падтрымка дзейнасці ініцыятыўнай групы |
| папячыцельскі савет | спонсарская дапамога базавых прадпрыемстваў |

**Асноўныя накірункі дзейнасці клуба “Мая сям’я”:**

- павышэнне педагагічнай і прававой культуры бацькоў,
- арганізацыя вольнага часу сямей,
- арганізацыя заняткаў аб’яднанняў па інтарэсах для дзяцей па працоўнаму выхаванню,
- псіхолага-педагагічнае суправаджэнне сямей,
- дзейнасць валанцёрскага атрада “Аднадумцы”,
- папулярызацыя сямейнага выхавання ў СМІ (рэклама, відэаролікі, артыкулы)

# ЭТАПЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

## І. Прагнастычна-арганізацыйны этап (падрыхтоўчы)

**Мэта:** стварыць умовы для рэалізацыі праекта, зацікавіць законных прадстаўнікоў вучняў, педагогаў тэмай праекта, вызваць жаданне стаць яго ўдзельнікам.

| № п.п | Змест работы | Тэрмін | Адказныя |
|---|---|---|---|
| 1. | Стварэнне бібліятэкі навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры “Сямейнае выхаванне”,”Гендэрная культура”, “Сям’я і школа – партнёры ў выхаванні”. | Пастаянна 2019 – 2020 | Кіраўнік клуба |
| 2. | Арганізацыя работы клуба “Мая сям’я”:<br>✓ забеспячэнне нарматыўна-прававой базай,<br>✓ распрацоўка статута. | Верасень 2019 | Кіраўнік клуба, актыў |
| 3. | Арганізацыйнае пасяджэнне клуба “Мая сям’я”:<br>✓ выбары кіраўніка клуба і актыву,<br>✓ размеркаванне абавязкаў,<br>✓ абмеркаванне ідэй па зместу работы,<br>✓ складанне плана работы. | Верасень 2019 | Кіраўнік клуба |
| 4. | Пасяджэнні творчай групы рэалізацыі праекта: карэкцыя плана, аналіз работы, вырашэнне пытанняў | Раз у месяц | Кіраўнік клуба |
| 5. | Арганізацыя рэкламнай кампаніі аб дзейнасці клуба “Мая сям’я” | Пастаянна | Кіраўнік валанцёрскага атрада |
| 6. | Збор інфармацыі пра сем’і мікрараёна школы | Верасень 2019 | Педагог-псіхолаг |
| 7. | Наладжванне супрацоўніцтва з праваслаўнай царквой: арганізацыя сустрэч на тэму “Праваслаўныя традыцыі ў | Раз у чвэрць (асобны план) | Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | сямейным выхаванні” | | |
| **8.** | Арганізацыя дзейнасці валанцёрскага атрада “Аднадумцы” па прапагандзе сямейных каштоўнасцей (выраб і рапаўсюджванне памятак аб сямейным выхаванні, буклетаў аб дзейнасці клуба, “Маланак”, насценгазет) | Кастрычнік 2019 | Кіраўнік клуба, кіраўнік валанцёрскага атрада |
| **9.** | Напісанне артыкулаў для СМІ з вопыту сямейнага выхавання. Размяшчэнне інфармацыі на сайце ўстановы адукацыі | Пастаянна . | Кіраўнік клуба, актыў |
| **10.** | Арганізацыя фотарэкламы “Шчаслівая сям’я” сродкамі сайта, насценгазет, буклетаў, ролікаў) | 1 раз у п/г. | Кіраўнік клуба, творчая група |
| **11.** | Прыцягненне бацькоў да арганізацыі гурткоў “Умелыя ручкі” (для хлопчыкаў), “Гаспадынька” (для дзяучынак) **(дадатак 1)**, правядзення майстар-класаў па дэкаратыўна-прыкладной творчасці: “Беларуская лялька”, “Сталярны майстар”, “Беларуская вышыўка” | Верасень 2019<br><br>У адпаведнасці з планам работы | Педагогі дадатковай адукацыі |

## II. Практычны этап

**Мэта:** арганізаваць супрацоўніцтва з бацькоўскай грамадскасцю, дзецьмі, педагогамі, соцыумам з мэтай рэалізацыі задач праекта.

| **№ п.п** | **Змест работы** | **Тэрмін** | **Адказныя** |
|---|---|---|---|
| **Фарміраванне сямейных традыцый і правіл** | | | |
| **1.** | Праца над стварэннем радаводу (генеалагічнага дрэва ) | 2019-2020 | Члены сям’і |
| **2.** | Вядзенне дзённіка сям’і | Пастаянна | Члены сям’і |
| **3.** | Збор і сістэматызацыя сямейных рэліквій | Пастаянна (традыцыйна) | Члены сям’і |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **4.** | Дзень сямейных зносін “Усёй сям’ёй за круглым сталом” | 1 раз у месяц | Бацькі |
| **5.** | Вандроўкі па роднаму краю | Па магчымасці (канікулярны час) | Бацькі |
| **6.** | Тур выхаднога дня :<br>• “Бяры, сыне, вуду!”<br>• “Усёй сям’ёю на прыроду!”<br>• “Да бабулі ў вёску!” (для горада)<br>• “Выкапаем бульбачку!”<br>• “Усе на ролікі і веласіпеды!” | 2019 – 2020 (па магчымасці) | Члены сям’і |
| **7.** | Арганізацыя працоўнага выхавання: выкананне пастаянных і разавых даручэнняў, сумесныя працоўныя справы | Пастаянна | Бацькі |
| **8.** | Стварэнне відэаролікаў “Вось якія мы!” | 2019 – 2021 | Члены сям’і |
| **9.** | Вядзенне альбома “Сямейны фоталетапіс” (традыцыя) | Пастаянна | Члены сям’і |
| **10.** | Укараненне прынцыпаў і правіл сямейнага выхавання:<br>• “Робім урокі разам!”,<br>• “10 хвілін на гульню!”, “Фізічны (тактыльны) і псіхалагічны кантакт з дзіцем” | Пастаянна | Бацькі |
| **11.** | Навагоднія святы з Дзедам Марозам (для дзяцей дашкольнага ўзросту) | Пастаянна (па магчымасці) | Бацькі |
| **12.** | Свята “Дзень нараджэння ўсёй сям’ёй” (традыцыя) | Пастаянна | Бацькі, члены сям’і |
| **13.** | Сюрпрыз “Падарунак ад Дзеда Мароза” (традыцыя) | Пастаянна (навагодняя ноч) | Бацькі |
| **14.** | Прафарыентацыйная акцыя “Разам на работу” (знаёмства дзяцей з месцам працы бацькоў) | 1 раз у год (па магчымасці) | Бацькі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **15.** | Сямейнае святкаванне “Дня абаронцаў Айчыны”, “8 Сакавіка”, падрыхтоўка падарункаў для членаў сям’і. | Каляндарныя даты | Бацькі |
| **Арганізацыя вольнага часу бацькоў і дзяцей у шосты школьны дзень** | | | |
| **Першы год рэалізацыі праекта** | | | |
| **1.** | Конкурс-выстава “Самы смешны сямейны фотаздымак” | Верасень | Педагог-арганізатар |
| **2.** | Час зносін “За кубачкам кавы” | Верасень | Актыў клуба |
| **3.** | Ролевая гульня “Значнасць кожнага члена сям’і” | Кастрычнік | Класныя кіраўнікі |
| **4.** | Канцэрт-ушанаванне “Дзень Маці” | Кастрычнік | Педагог-арганізатар |
| **5.** | Конкурс-спаборніцтва “Бабуля можа ўсё!” | Лістапад | Актыў клуба |
| **6.** | Конкурс сачыненняў, эсэ “Мая сям’я – мая крэпасць” (для дзяцей) | Лістапад | Бацькі, дзеці |
| **7.** | Выстава “Сямейны архіў” (граматы, узнагароды, пасведчанні) | Снежань | Актыў клуба |
| **8.** | Спартыўна-гульнёвая праграма “Рэцэпты здароўя для ўсёй сям’і” | Снежань | Педагог-арганізатар |
| **9.** | Круглы стол “Дом, побыт, бюджэт” | Студзень | Актыў клуба |
| **10.** | Турнір “Бацькі і нашчадкі!” | Люты | Педагог-арганізатар |
| **11.** | Выраб віншавальных паштовак “ Са святам 8 Сакавіка!” | Штогод | Педагогі дадатковай адукацыі |
| **12.** | Канцэртна-віншавальная праграма “Са святам 8 Сакавіка!” | Сакавік | Педагог-арганізатар, класныя кіраўнікі |
| **13.** | Конкурс фотапрэзентацый “Мая сям’я – мая крэпасць” | Сакавік | Актыў клуба |
| **14.** | Панарама вопыту выхавання ў сям’і “Нашы дамашнія справы” | Красавік | Актыў клуба |
| **15.** | Сустрэча-прэзентацыя “А наша | Красавік | Кіраўнік |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | сям'я шматдзетная!" | | клуба, класныя кіраўнікі |
| **16.** | Конкурс малюнкаў на асфальце "Свет сям'і" | Май | Педагог-арганізатар |
| **17.** | Выстава-конкурс калажаў "Сем "Я" да дня сям'і | Май 2020 | Бацькі, дзеці |
| **Другі год рэалізацыі праекта** | | | |
| **18.** | Гульнёвая праграма "Брацікі і сястрычкі" | Верасень | Педагог-арганізатар |
| **19.** | Конкурс на лепшую сацыяльную рэкламу "Каштоўнасці сям'і і дзяцінства" | Кастрычнік | Валанцёрскі атрад "Аднадумцы" |
| **20.** | Брэйн-рынг "Хатняя энцыклапедыя" | Лістапад | Актыў клуба |
| **21.** | Выстава-продаж "Запрашаем на кірмаш!" | Лістапад | Актыў клуба, бацькі, класныя кіраўнікі |
| **22.** | Дзень імянінніка (зіма, вясна, лета, восень) | 2019 – 2021 | Актыў клуба, педагог-арганізатар |
| **23.** | Час творчасці "Цацка сваімі рукамі" | Снежань | Педагогі дадатковай адукацыі |
| **24.** | Конкурсна-гульнёвая праграма "Сямейны калейдаскоп" | Сакавік 2016 г. | Актыў клуба, педагог-арганізатар |
| **25.** | Гульнёвая праграма "Тата, мама, я – спартыўная сям'я" | Студзень | Педагог-арганізатар |
| **26.** | Конкурс прэзентацый "Прафесіі маіх бацькоў" (публічная абарона) | Люты | Актыў клуба, класныя кіраўнікі, бацькі |
| **27.** | Спартландыя "Вясёлыя сямейныя эстафеты" | Сакавік | Педагог-арганізатар |
| **28.** | Конкурс кулінарнага майстэрства "Смачна есці!" | Сакавік | Бацькі |
| **29.** | Творчая майстэрня-выстава "Захапленні маёй сям'і" альбо "Рукамі маёй матулі" | Красавік | Педагогі дадатковай адукацыі, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | бацькі |
| **30.** | Майстар-клас “Сувеніры сваімі рукамі” | Май | Педагогі дадатковай адукацыі, бацькі |
| **31.** | Акцыя-прэзентацыя “Запрашаем у госці!” (знаёмства з ідэямі арганізацыі побыту, вядзення гаспадаркі) | Май | Актыў клуба, бацькі |
| **32.** | Вечарына “Ушанаванне юбіляраў шлюбу” (сумесна з СДК) | Жнівень | Кіраўнік клуба, актыў |
| **33.** | Дабрачынная акцыя “Міласэрнасць” (збор сродкаў у падтрымку малазабяспечаных сямей) | Раз у год | Валанцёрскі атрад “Аднадумцы”, Папячыцельскі савет |
| **34.** | Выстава-прэзентацыя “Мой радавод” (“Генеалагічнае дрэва маёй сям’і”) | Верасень | Бацькі, дзеці |
| **Дзейнасць спецыялістаў СППС па фарміраванню прававой культуры і прафілактыцы сямейнай неблаганадзейнасці** | | | |
| **1.** | Анкетаванне “Сямейныя праблемы” | Верасень | Педагог-псіхолаг |
| **2.** | Круглы стол “Нашы дзеці – наша адказнасць” | Верасень | Педагог сацыяльны |
| **3.** | Анкетаванне “Камфортнасць дзіцяці ў сям’і” (старт-дыягностыка) | Кастрычнік | Педагог-псіхолаг |
| **4.** | Маніторынг “Узровень прававых ведаў” | Кастрычнік | Педагог сацыяльны |
| **5.** | Правядзенне тэст-шкалы “Значнасць сямейных каштоўнасцей” | Лістапад | Педагог-псіхолаг |
| **6.** | Семінар-практыкум для бацькоў “Сямейны ўклад у выхаванні духоўна-маральных каштоўнасцей моладзі” | Снежань | Кіраўнік клуба |
| **7.** | Бацькоўскі сход “Абмяркуем праблемы разам” | Снежань | Кіраўнік клуба, актыў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **8.** | Кансультацыйная дапамога СППС (індывідуальныя, групавыя) | Пастаянна (асобны план) | Спецыялісты СППС |
| **9.** | Круглыя сталы:<br>• “Народная педагогіка і сямейнае выхаванне”,<br>• “Маці і бацька – узор паводзін для дзіцяці”,<br>• “Здаровы лад жыцця як у маральна-духоўным, так і фізічным сэнсе” | Студзень<br><br>Люты<br><br>Сакавік | Кіраўнік клуба, актыў |
| **10.** | Правядзенне псіхалагічных тэстаў і трэнінгаў | Пастаянна Снежань (асобны план) | Спецыялісты СППС |
| **11.** | Практыкум “Фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця ” | Снежань | Спецыялісты СППС |
| **12.** | Педагагічныя чытанні для маладых сямей:<br>• “Маральнасць – аснова здаровай сям’і”,<br>• “Каханне і вернасць – свет сям’і” | Пры неабходнасці | Кіраўнік клуба, актыў |
| **13.** | Анкета “Камфортнасць дзіцяці ў сям’і” (заключная дыягностыка) | Май 2021 | Спецыялісты СППС |
| **14.** | Стварэнне  і распаўсюджванне буклетаў “Сакрэты сямейнага выхавання” | Май 2021 | Валанцёрскі атрад “Аднадумцы” |

### III. Вынікова-рэфлексійны этап

**Мэта:** правядзенне рэфлексіі, аналізу,  маніторынгу рэалізацыі праекта; абагульненне і прэзентацыя станоўчага вопыту

| **№ п.п** | **Змест работы** | **Тэрмін** | **Адказныя** |
|---|---|---|---|
| **1.** | Справаздача-рэклама аб дзейнасці клуба “Мая сям’я” на агульнашкольным бацькоўскім сходзе “Нашы справы” | Штогод | Кіраўнік клуба, актыў |
| **2.** | Вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне вопыту | Май 2021 | Кіраўнік клуба, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | сямейнага выхавання “Мая сям’я – мая падтрымка” | | намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце |
| **3.** | Свабодны мікрафон “Мая сям’я: вынікі ўдзелу ў праекце” | Май 2021 | Кіраўнік клуба, актыў |
| **4.** | Абагульненне вопыту работы клуба “Мая сям’я” | Верасень 2021 | Кіраўнік клуба, намеснік дырэктара па ВР |
| **5.** | Правядзенне выніковага фестываля-прэзентацыі “Візітная картка сям’і” ці “Сямейны партрэт” (прэзентацыя вопыту сямейнага выхавання) да Дня абароны дзяцей | 31 мая 2021 | Кіраўнік клуба, актыў, бацькі |
| **6.** | Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне па наступных намінацыях:<br>❖ “Сям’я года”<br>❖ “Мама года”<br>❖ “Тата года”<br>❖ “Прыз сімпатый гледачоў” | 31 мая 2021 | Кіраўнік клуба, актыў, адміністрацыя ўстановы адукацыі |
| **7.** | Выдача сертыфіката ўдзельніка клуба ў межах праекта | 31 мая 2021 | Кіраўнік клуба |

## Вывады аб рэалізацыі праекта

Сацыяльны праект “Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба “Мая сям’я” знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі ў дзяржаўнай установе адукацыі “Гоцкі вучэбна-педагагічны-комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа Салігорскага раёна”.

Галоўным вынікам першага года рэалізацыі праекта з’яўляецца стварэнне творчага актыву бацькоўскага клуба “Мая сям’я”, якія сваёй дзейнасцю прыцягваюць на свой бок ўсё больш аднадумцаў. На пачатак верасня 2019 года членамі клуба з’яўляліся 10 сямей (26 вучняў), зараз – 13 сямей (32 вучні). Лічым, што для нашай сельскай мясцовасці гэта значны паказчык.

Доўгатэрміновы перыяд рэалізацыі праекта гаворыць аб тым, што патэнцыял разнастайных форм і метадаў работы ў межах клуба дазволіць зацікавіць прыцягнуць яшчэ большую колькасць сямей.

Цікавыя справы ў межах праекта маюць рэзананс у вёсцы, пра іх гавораць, іх абмяркоўваюць. Значныя ключавыя справы праводзяцца ў актавай зале ў прысутнасці мясцовых жыхароў, бацькоўскай грамадскасці. Павялічылася і колькасць бацькоў на класных і агульнашкольных бацькоўскіх сходах.

У сацыяльна-педагагічнай характарыстыцы ўстановы адукацыі 5 прыёмных сямей,  у якіх выхоўваецца 5 прыёмных дзяцей. Яны – члены клуба “Прыёмная сям’я”. Але гэта не мяшае ім быць актыўнымі ўдзельнікамі  мерапрыемстваў клуба “Мая сям’я”.

Законныя прадстаўнікі вучняў 1-4 класаў – асабліва актыўныя ўдзельнікі рэалізацыі мерапрыемстваў праекта: выстаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, касцюміраваных дзей у Навагодніх святах, Тыдні маці, 8 Сакавіка, дабрачынных акцыях.

У лютым таты, члены каманды “Бацькі” выступілі супраць каманды сыноў-“Нашчадкаў” у турніры, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны, але бацькі перамагчы маладое пакаленне не змаглі. Затое матулі са сваімі дочкамі ў конкусе “Сямейных дуэтаў“ прадэманстравалі адзінства ў творчасці і кулінарным майстэрстве.

Праца клуба па фарміраванню сямейных традыцый таксама прынесла свой плён. Сем’і актывізавалі работу па стварэнню сямейных фотаальбомаў. Дзве сям’і ўжо выступілі з прэзентацыямі аб сваім вопыце сямейнага выхавання.

На агульнашкольных бацькоўскіх сходах валанцёрская група “Аднадумцы” стварае прывабныя інфармацыйныя “маланкі”, раздае буклеты і лістоўкі па сямейнаму выхаванню.

Вынікі працы па рэалізацыі  праекта лічым здавальняючымі.

## Выкарыстаныя крыніцы інфармацыі


1. Антыпава, Е.В. Выхаваўчы патэнцыял сучаснай сям’і. / Е.В. Антыпава // Праблемы выхавання. – 2006. – № 6
2. Осіпава, М. П. Як стаць эфектыўным бацькам / М.П. Осіпава // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2012. – № 5.
3. Педагогіка і псіхалогія сямейнага выхавання / М.П. Осіпава і др.; пад рэд.М. П. Осіпавай. – Мінск, 2008.
4. Пракапенка, Н.І. Сістэма работы гімназіі з бацькамі і законнымі прадстаўнікамі вучняў / Н.І. Пракапенка // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2012. – № 7.
5. Свята ў кожны дом (кніга для ўсёй сям’і) /Аўт.скл. О.Э.Каласоўская. – МН.: Юніспрэс, 2002.– 240.с.
6. Чэчэт, В. В. Бацькоўства: з гісторыі і сучаснасці / В.В.Чэчэт // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2012. – № 5.
7. Чэчэт, В. В. Педагогіка сямейнага выхавання / В. В. Чэчэт. – Мінск : Выд.”Красіка-прынт”, 1998.
8. http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243
9. http://mp.minsk.edu.by

**Дадатак 1**

| **Прыкладны змест плана гуртка “Умелыя ручкі” (для хлопчыкаў)** | **Прыкладны змест плана гуртка “Гаспадынька” (для дзяўчынак)** |
|---|---|
| 1. Што такое мужчынская работа? | 1. Салата з гародніны. |
| 2. Інструменты, прылады працы | 2. Выраб адзення для лялькі. |
| 3. Выраб рамкі для фотаздымка. | 3. Святочны падарунак. |
| 4. Калыбель для лялькі. | 4. Загатоўка гародніны на зіму. |
| 5. Кармушкі для птушак. | 5. Рыхтуем “салодкі” стол. |
| 6. Выпілоўванне лобзікам сувеніра для матулі. | 6. Асновы этыкету. |
| 7. Майструем шпакоўню. | 7. Вышываем сурвэтку. |
| 8. Праца ў агародзе. | 8. Выпякаем бліны. |
| 9. Рыбалка – любімы адпачынак. | 9. Садзім  кветкі. |

**Дадатак 2**

## Сістэма партнёрскіх сувязяў па рэалізацыі праекта "Выхаванне сямейнай культуры сродкамі клуба "Мая сям'я"

